Ц. В. Вайда

# БЕЛАРУСКАЯ КНІЖНАЯ КУЛЬТУРА XVI СТАГОДДЗЯ: УКЛАД У СЛАВЯНСКАЕ КНІГАДРУКАВАННЕ

*У дакладзе аналізуецца развіццё беларускага кнігадрукавання і яго распаўсюджванне. Тэма закранае дзейнасць заснавальніка друкарскай справы на ўсходнеславянскіх землях Францыска Скарыны. Разглядаюцца месцы зараджэння і распаўсюджвання беларускай кніжнай кніьтуры: Прага, Вільня, Нясвіж, Брэст, Астрог.*

Францыск Скарына – заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання. Чалавек, які нарадзіўся ў горадзе Полацку ў купецкай сям'і, змог стаць тым, чыёй дзейнасцю захапляецца ўвесь свет. Ф. Скарына – выбітны ўсходнеславянскі асветнік, гуманіст, філосаф і першадрукар эпохі Адраджэння. З 1504 па 1506 гг. Францыск вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, і закончыў яго са ступенню бакалаўра. Затым Ф. Скарына паступіў у Падуанскі ўніверсітэт – адзін з самых знакамітых універсітэтаў Еўропы. Закончыўшы яго ў 1512 г., атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны і вырашыў перабрацца ў Прагу, дзе заснаваў сваю першую друкарню. Пры гэтым ён не імкнуўся зарабіць шмат грошай. У сваіх кнігах Францыск называў сябе «русином», «руским», «рожденный на руском языке», а дзейнасць прысвячаў «своей братской Руси». Ф. Скарына ў 1516–1517 гг. пачаў друкаваць кнігі пад агульнай назвай: «Библия руска выложена доктором Франциском Скориной из славного города Полоцка Богу ко чти и людям посполитым для доброго научения». Паміж 1520 і 1525 гадамі Ф. Скарына па невядомых прычынах перанёс сваю друкарню ў Вільню. У гэтым Ф. Скарыне матэрыяльна дапамагалі такія полацкія і віленскія мяшчане і грамадскія дзеячы, як Багдан Онкаў, Якуб Бабіч і Юрый Адвернік. Некаторыя кнігі Ф. Скарына друкаваў на царкоўнаславянскай мове («Псалтыр», «Апостал»), а іншыя на старабеларускай мове. «Псалтыр» і «Апостал» былі вельмі распаўсюджанымі, бо Ф. Скарына імкнуўся зрабіць свае кнігі даступнымі нават для беднага і менш адукаванага пласта насельніцтва. Выданні адрозніваліся высокай якасцю: выкарытоўваліся унікальныя шрыфты, складаныя гравюры і ініцыялы. Асаблівая ўвага надавалася прадмовам і пасляслоўям да кніг, што нетыпова для царкоўнай літаратуры. Верагодна, Ф. Скарына выдаў бы і больш кніг, але ў 1530 г. у Вільні адбыўся пажар, які знішчыў друкарню. У выніку асветнік вярнуўся назад у Прагу. Дзейнасць Ф. Скарыны, безумоўна, дала моцны штуршок развіццю кніжнасці, яе распаўсюджванню на тэрыторыі Беларусі. Дзякуючы яму, тэхналогіі кнігадрукавання з'явіліся і на беларускіх землях.

Першая друкарня на тэрыторыі Беларусі ў сучасных межах была заснавана ў 1553 г. у Брэсце. Яна належала Мікалаю Радзівілу Чорнаму, які дзейнічаў у місіянерскіх мэтах. У той час большасць друкарняў у Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) залежалі ад буйных землеўласнікаў – заступнікаў кальвіністкіх абшчын, і гэта залежнасць у значнай ступені вызначала знешнія формы, мову і ідэалагічны кірунак выданняў. Мікалай Радзівіл Чорны запрашаў у Брэст выдаўцоў Б. Ваявудку, С. Мармеліуса, Ц. Базыліка. Першыя выданні, выпушчаныя Б. Ваявудкай, адпавядалі патрабаванням пратэстантызму. Былі надрукаваныя такія кнігі, як Вялікі і Малы Катэхізісы, «Два пасланні» (1559 г., адказ папскаму нунцыю Дзіпаміна, дзе крытыкавалася царкоўная палітыка Рымскай курыі, якая бесцырымонна ўмешвалася ў справы іншых краін), «Гісторыя пра Папу Іаанна VIII, які быў жанчынай» (1560). Многія кнігі выходзілі без назвы выдаўца. Найбольшага росквіту друкарня ў Брэсце дасягнула пад кіраўніцтвам Ц. Базыліка. Брэсцкая друкарня выпусціла больш за 40 кніг на лацінскай і польскай мовах, у якіх былі адлюстраваныя духоўныя і ідэйныя сувязі прагрэсіўных дзеячаў беларускай, літоўскай і польскай культур, разнастайныя літаратурныя, гістарычныя, палітычныя працы. Аднак, як і ў выпадку з Ф. Скарынай, мноства выдадзеных тут кніг было знішчана, але па іншай прычыне. Сыны Мікалая Радзівіла Чорнага, якія перайшлі ў каталіцтва, палілі кнігі, асабліва экземпляры кальвінісцкай Бібліі. Напрыклад, Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка, які зачыніў друканю ў Брэсце, купіў на 5 тысяч залатых кальвінісцкія кнігі і спаліў іх на віленскім рынку.

Кажучы пра брэсцкую друкарню, трэба ўзгадаць і нясвіжскую. Яе заснавальнікам быў той самы Мікалай Радзівіл Чорны, а самыя папулярныя творы выдаў Сымон Будны. Сыны Мікалая Радзівіла Чорнага таксама разбурылі яе да падставы пасля смерці бацькі ў 1565 г. Аднак нясвіжская друкарня паспела ўнесці свой уклад, падрыхтаваўшы шрыфт для першай тыпаграфіі ў Маскве, адчыненай Іванам Фёдаравым, адным з пераемнікаў Ф. Скарыны.

1 сакавіка 1564 г. у Маскве выйшла кніга, у якой указвалася месца і час выдання, імёны не толькі друкароў, але і выдаўцоў-замоўшчыкаў і нават выкладаліся прычыны выдання. Гэта быў знакаміты «Апостал» – праца беларускіх майстроў Івана Фёдарава і Пятра Цімафеева Мсціслаўца, першых рускіх кнігавыдаўцоў. Няхай «Апостал» і не ўтрымліваў у сабе ніякіх слядоў нясвіжскай друкарні, але перад яго выданнем выйшла так званае ананімнае Евангелле, напісанае прыкладна ў 1560 г. Яго шрыфты супадалі з літарамі нясвіжскай друкарні, якія сустракаліся ў работах Сымона Будная, пераемніка Ф. Скарыны. У тым, што ананімнае Евангелле было напісана скарынаўскімі літарамі, пераконваў нас Васіль Цяпінскі, які надрукаваў сваё Евангелле ў 1570 г. У прадмове да яго ён узгадваў «Евангелле Московское недавно друкованое». Залежнасць маскоўскага кнігадрукавання ад беларускага таксама ўскосна пацвярджаецца ідэнтычнасцю паперы ў маскоўскім і нясвіжскім выданнях.

У 1574 г. друкарня ў Вільні была адноўлена, дзякуючы пераемніку Ф. Скарыны Пятру Мсціслаўцу. На сродкі магілёўскіх купцоў Кузьмы і Лукаша Мамонічаў ён выдаў больш за 80 кніг, з іх больш за 50 – на старабеларускай мове. Сярод іх – «Часовник», «Евангелие напрестольное» і «Псалтырь». Друкарня Мамонічаў была адзінай беларускай друкарняй, якая выпускала зборнікі заканадаўчых актаў, выданні прававога характару, у тым ліку «Трибунал обывателям Великого Княжества Литовского», «Статут Великого Княжества Литовского», канстытуцыі вальных сеймаў, а таксама шэраг палемічных твораў у абарону уніі, напісаных Іпацiем Пацеем. Кнігі вызначаліся высокім паліграфічным і мастацка-арнаментальным афармленнем. Тут упершыню былі выкарыстаны выробленыя Грынем Іванавічам курсіўныя шрыфты, якія адлюстроўвалі графіку канцылярскага пісьма. З друкарняй супрацоўнічаў віленскі друкар Васіль Гарабарда. З-за конфлікту паміж П. Мсціслаўцам і Мамонічамі, якія імкнуліся цалкам кантраляваць кнігадрукаванне, у 1576 г. дзейнасць друканні была прыпынена, а ў 1583 г. Кузьма і Лукаш Мамонічы аднавілі яе работу. Друкарню Мамонічаў фінансава падтрымлівалі праваслаўныя шляхцічы Зарэцкія. У 1586 і 1593 гадах пры падтрымцы канцлера ВКЛ Льва Сапегі яна атрымала прывілеі, якія давалі часовае манапольнае права на выданне кніг на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах.

У 1580 г. з'явілася друкарня ў Астрогу. Яе заснавальнікам стаў Іван Фёдараў, які на сродкі князя В. Астрожскага пачаў друкаваць кнігі, у тым ліку «Библию». Як шрыфты львоўскіх выданняў І. Фёдарава, так і віленскіх выданняў П. Мсціслаўца шмат у чым запазычаны з кніг Ф. Скарыны. У прыватнасці, Біблія Астрожская мела шмат ініцыялаў і фарзацаў, запазычаных з выданняў Ф. Скарыны. Другое выданне Астрожскай Бібліі, што выйшла 1 жніўня 1581 г., утрымлівала яшчэ больш віленскага шрыфта.

Такім чынам, беларуская кніжная культура XVI в. з'яўлялася унікальнай. Шматлікія друкарні, якія функцыянавалі на беларускіх землях, узбагацілі кніжны свет новымі для таго часу мастацкімі стылямі, павысілі адукаванасць сярод простага насельніцтва, а дзейнасць Ф. Скарыны і наступных пакаленняў кніжнікаў стварыла фундамент для развіцця ўсходнеславянскай пісьмовасці і кнігадрукавання.

### *Спіс літаратуры*


1. Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.
2. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік / Я. К. Новік [і інш.]. – Мінск : БДУІР, 2020. – 238 с.
3. Голенченко, Г. Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII в. / Г. Я. Голенченко. – Минск : Наука и техника, 1989. – 283 с.
4. Францыск Скарына: энцыклапедыя / рэдкал. : У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 568 с.



*Вайда Ціхан Вітальевіч*, студэнт 1 курса ФИТУ БГУИР, tikhon.vaido@gmail.com

*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by